# Старонкі гісторыі Капыльшчыны



**Дзяржаўная ўстанова культуры**
**«Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі»**

**Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці**
**і метадычнай работы**

# Старонкі гісторыі Капыльшчыны

## (Каляндар краязнаўчых дат і падзей на 2026 год)

**Капыль, 2025**

**Грамадскія дзеячы**

**19 мая -** **80 гадоў** з дня нараджэння **Драко Валерыя Уладзіміравіча**, педагога, выдатніка народнай асветы, былога дэлутата Палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ураджэнца в. Саўкова Доктаравіцкага сельскага Савета (19.05.1946)

**23 мая -** **95 гадоў** з дня нараджэння **Мазалякі Івана Міхайлавіча,** беларускага дзяржаўнага дзеяча, міністра прамысловага будаўніцтва БССР (1979 – 1985), намесніка міністра прамысловага будаўніцтва (1985 – 1987), ураджэнца вёскі Яўсеевічы Грозаўскага сельскага Савета (23.05.1931 – 13.05.2006)

**27 ліпеня -** **135 гадоў** з дня нараджэння **Кандыбовіча Сымона Сцяпанавіча,** беларускага дзяржаўнага дзеяча, гісторыка, ураджэнца вёскі Старыца Слабада -Кучынскага сельскага Савета (21.07.1891 – 27.09.1972)

**10 кастрычніка – 120 гадоў** з дня нараджэння **Жалязніковіча Паўла Арсенавіча,** грамадска-палітычнага дзеяча Беларусі, ураджэнца вёскі Лешня Блеўчыцкага сельскага Савета (10.10.1906 – 06.11.1971)

**Навукоўцы**

**9 студзеня -** **85 гадоў** з дня нараджэння **Емельянава Валерыя Нілавіча** савецкага і расійскага вучонага ў галіне гарэння гетэрагенных кандэнсатных сістэм, доктара тэхнічных навук, прафесара, лаурэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1985), ураджэнца г. Капыля (09.01.1941)

**14 студзеня –** **90 гадоў** з дня нараджэння **Гурскага Антона Іванавіча**, кандыдата філалагічных навук, былога навуковага супрацоўніка Інстытута мастацтва этнаграфіі і фальклору, лаурэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за ўдзел ў падрыхтоўцы мнагатомнага навуковага выдання «Беларуская народная творчасць», ураджэнца вёскі Лугавая Слабада-Кучынскага сельскага Савета (14.01.1936 – 01.07.2016)

**11 лютага -** **140 гадоў** з дня нараджэння **Казака Аляксея Захаравіча**, краязнаўцы, былога намесніка старшыні Цэнтральнага Бюро краязнаўства Інстытута белурускай культуры і Беларусай Акадэміі навук (1925-1930), ураджэнца вёскі Бучаціна (11.02.1886 – 01.09.1938)

**13 сакавіка -** **205 гадоў** з дня нараджэння **Красоўскага Антона Якаўлевіча** (Эдуарда-Антона) расійскага вучонага ў галіне гінекалогіі і акушэрства, педагога, грамадскага дзеяча, аднаго з заснавальнікаў навуковага акушэрства і гінекалогіі, ураджэнца вёскі Грозава (13.03.1821 – 13 .04.1898)

**14 сакавіка –** **80 гадоў** з дня нараджэння **Кавалені Аляксандра Аляксандравіча**, акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі, доктара гістарычных навук, прафесара, лаўрэата прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2020), ураджэнца г. Капыля (14.03.1946)

**19 сакавіка -** **80 гадоў** з дня нараджэння Пашкевіч (Брыкальскай) Людмілы Антонаўны, беларускага вучонага ў галіне артапедыі і траўматалогіі, доктара медыцынскіх навук, прафесара, заслужанага ўрача Рэспублікі Беларусь, ураджэнкі г. Капыля (19.03.1946)

**15 мая -** **85 гадоў** з дня нараджэння **Кісяля Віктара Паўлавіча**, рускага гісторыка і педагога, доктара гістарычных навук, ураджэнца вёскі Ст. Капыль Капыльскага сельскага Савета (15.05.1941)

**15 мая -** **90 гадоў** з дня нараджэння **Галушкі Васіля Міхайлавіча**, вучонага ў галіне сельскагаспадарчых навук, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Акадэміі аграрных навук, ураджэнца вёскі Домантовічы Блеўчыцкага сельскага Савета (15.05.1936 – 09.07.2021)

**7 жніўня -** **90 гадоў** з дня нараджэння **Рылава Генадзя Пятровіча**, доктара сельскагаспадарчых навук, вядомага садавода, які стварыў пад Шчучынам буйнейшы ў Еўропе памалагічны сад, у якім налічвалася каля 5 тысяч сартоў пладовых і ягадных культур, ураджэнца вёскі Куцаўшчына Цімкавіцкага сельскага Савета (07.08.1936 – 2021)

**14 верасня -** **100 гадоў** з дня нараджэння **Шакуна Льва Міхайлавіча**, доктара філалагічных навук, прафесара, заслужанага работніка вышэйшай школы Беларусі, лаурэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі за вучэбны дапаможнік «Гісторыя беларускай мовы» (1986), ураджэнца вёскі Браткава 14.09.1926 – 06.11.1996)

**27 верасня –** **90 гадоў** з дня нараджэння **Копціка Івана Канстанцінавіча**, беларускага вучонага-селекцыянера, доктара сельскагаспадарчых навук, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Беларусі, лаурэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за вывядзенне сістэмы сартоў азімай пшаніцы і тэхналогіі вытворчасці зярна харчовага назначэння (1998), ураджэнца вёскі Рачкевічы Цімкавіцкага сельскага Савета (27.09.1936 – 04.02.2025)

**25 кастрычніка -** **85 гадоў** з дня нараджэння **Каляды Канстанціна Уладзіміравіча,** вучонага ў галіне раслінаводства, доктара сельсгаспадарчых навук, прафесара, ураджэнца вёскі Старыца (25.10.1941)

**18 лістапада –** **80 гадоў** з дня нараджэння **Родчанкі Уладзіміра Віктаравіча**, расійскага вучонага ў галіне стварэння і эксплуатацыі лятальных апаратаў, доктара тэхнічных навук, прафесара, акадэміка Расійскай акадэміі касманаўтыкі імя К. Э. Цыялкоўскага,ураджэнца в. Агароднікі Цімкавіцкага сельскага Савета (18.11.1946)

## Героі Сацыялістычнай Працы

**23 жніўня -** **100 год** з дня нараджэння **Макаронка Уладзіміра Аляксандравіча**, Героя Сацыялістычнай Працы (23.08.1926 – 29.08.1982)

## Военачальнікі. Удзельнікі і героі Вялікай Айчыннай вайны. Воіны-інтэрнацыяналісты.

**23 лютага -** **70 гадоў** з дня нараджэння **Вайцяховіча Валянціна Паўлавіча**, воіна-інтэрнацыяналіста, ураджэнца вёскі Дусаеўшчына Капыльскага сельскага Савета (23.02.1956 – 29.05.1982)

**15 сакавіка -** **120 гадоў** з дня нараджэння **Торыка Мікалая Антонавіча,** віцэ-адмірала, ураджэнца вёскі Перавоз Доктаравіцкага сельскага Савета (15.03.1906 – 15.04.1999)

**5 мая -** **80 гадоў** з дня нараджэння **Карповіча Аляксандра Аляксандравіча**, воіна-інтэрнацыяналіста, ураджэнца вёскі Выня Бабаўнянскага сельскага Савета (05.05.1946 – 13.06.1982)

**30 мая -** **130 гадоў** з дня нараджэння **Давідоўскага Івана Елізар’евіча**, генерал-лейтэнанта, ураджэнца вёскі Грозава (30.05.1896 – 15.04.1960)

**15 жніўня –** **115 гадоў** з дня нараджэння **Драздовіча Вікенція Іосіфавіча**, Героя Савецкага Саюза, ураджэнца вёскі Навасёлкі Бабаўнянскага сельскага Савета (15.08.1911 – 03.12.1942)

**26 жніўня -** **110 гадоў** з дня нараджэння **Радкевіча Аляксандра Іванавіча**, Героя Савецкага Саюза, ураджэнца вескі Балгавічы Грозаўскага сельскага Савета (26.08.1916 – 17.10.1957)

**29 верасня -** **70 гадоў** з дня нараджэння **Булата Генадзя Мечыслававіча**, воіна-інтэрнацыяналіста, ураджэнца вёскі Душава Пацейкаўскага сельскага Савета (29.09.1956 – 25.12.1979)

## Пісьменнікі. Паэты. Літаратуразнаўцы.

**2 студзеня -** **190 гадоў** з дня нараджэння **Мэнделе Мойхер-Сфорыма (Саламона Майсеевіча Абрамовіча),** пісьменніка, класіка яўрэйскай літаратуры, ураджэнца г. Капыля (02.01.1836 – 08.12.1917)

**15 лютага –** **90 гадоў** з дня нараджэння **Чарніковіча Мікалая Васільевіча**, расійскага пісьменніка (Рэспубліка Карэлія), ураджэнца вёскі Смалічы Бучацінскага сельскага Савета (15.02.1936 – кастрычнік, 2016)

**28 лютага -** **95 гадоў** з дня нараджэння **Падневіча Рыгора Фёдаравіча**, літаратара, журналіста,ураджэнца вёскі Бучаціна (28.02.1931)

**9 красавіка -** **60 гадоў** з дня нараджэння **Ліпая Алеся (Аляксандра Іосіфавіча),** беларускага пазта і журналіста, які працаваў карэспандэнтам, рэдактарам аддзела навін газеты – «Знамя юности», заснавальніка і кіраўніка інтэрнэт-газеты «Белорусские новости» (2002), ураджэнца в. Андросаўшчына Слабадакучынскага сельскага Савета (09.04.1966–23.08.2018)

**24 ліпеня** **115 гадоў** з дня нараджэння **Анатоля Астрэйкі**, беларускага паэта, ураджэнца вёскі Пясочнае (24 07.1911 – 23.08.1978)

**3 жніўня -** **100 гадоў** з дня нараджэння Адамовіча Алеся (Аляксандра Міхайлавіча), пісьменніка, крытыка, літаратуразнаўцы, грамадскага дзеча, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, ураджэнца вёскі Канюхі Грозаўскага сельскага Савета (03.08.1926 – 26.01.1994)

**18 жніўня -** **80 гадоў** з дня нараджэння **Марціновіча Алеся Андрэевіча,** літаратуразнаўцы, крытыка, публіцыста, Лаурэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі(«Проза», заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Белрусь (18.08.1946)

**15 снежня -** **105 гадоў** з дня нараджэння **Аляксандровіча Сцяпана Хусейнавіча,** літаратуразнаўцы, крытыка і публіцыста, ураджэнца г. Капыля (15.12.1921 – 01. 05.1986)

**21 снежня -** **135 гадоў** з дня нараджэння **Падгорскага-Аколава Леанарда**, польскага паэта і перакладчыка, даследчыка жыцця і творчасці Адама Міцкевіча, ураджэнца вёскі Дусаеўшчына Капыльскага сельскага Савета (21.12.1891 – 04. 01.1957)

**2026 -** **155 гадоў** з дня нараджэння **Лобіка Лявона Сцяпанавіча**, беларускага паэта і публіцыста, ураджэнца вёскі Кукавічы Цімкавіцкага сельскага Савета (1871 1918)

## Дзеячы культуры, мастацтва, спорту

**27 лютага -** **100 гадоў** з дня нараджэння **Чыркуна Міхаіла Пятровіча**, дзеяча культуры, педагога, заслужанага работніка культуры, ураджэнца вёскі Браткава (27.02.1926 – 22.02.2000)

**1 сакавіка -** **95 гадоў** з дня нараджэння **Пасюкевіча Уладзіміра Маркавіча,** мастака, педагога, заслужанага дзеяча мастацтва Беларусі, ураджэнца г. Капыля (01.03.1931 – 15.05.2009)

**8 сакавіка -** **125 гадоў** з дня нараджэння **Серады Аляксандры Сямёнаўны**, майстра народнага ткацтва, ураджэнкі вёскі Лешня (08.03.1901 – 03.06.1981)

**12 красавіка – 95 гадоў** з дня нараджэння **Пятровіча Сяргея Астапавіча,** беларускага тэатразнаўцы, акцёра Тэатра юнага гледача, некаторы час быў намеснікам Міністра культуры Беларускай ССР, ураджэнца г. Капыля (12.04.1931 – 06.10. 1981)

**23 сакавіка -** **90 гадоў** з дня нараджэння **Бранавіцкага Віліуса Іванавіча**, заслужанага дзеяча культуры Беларусі, ураджэнца г. Капыля (23.03.1936 – 15.12.2004)

**16 красавіка -** **70 гадоў** з дня нараджэння **Гладкай Валянціны Фёдараўны**, спявачкі, стваральніцы, мастацкага кіраўніка, салісткі народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Неруш», заслужанага дзеяча культуры Беларусі, уралжэнкі вёскі Праснакі (16 04.1956)

**8 мая -** **75 гадоў** з дня нараджэння **Роцька Леаніда Міхайлавіча**, беларускага мастака дэкаратыўна-прыкладного мастацтва (мастацкая апрацоўка металу), дызайнера і жывапісца, ураджэнца вёскі Кель Капыльскага сельскага Савета (08.05.1951)

**6 чэрвеня -** **100 гадоў** з дня нараджэння **Пятровіча Генадзя Уладзіміравіча**, беларускага спевака, заслужанага артыста Беларусі, які спяваў у хоры Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі да 1995 года, ураджэнца вёскі Дусаеўшчына (06.06.1926 – 2008)

**10 верасня -** **95 гадоў** з дня нараджэння **Кныша Рамуальда Іванавіча**, беларускага трэнера па спартыўнай гімнастыцы, заслужанага дзеяча фізічнай культуры Беларусі, ураджэнца г. Капыля (10.09.1931 – 19.04.2019)

**13 кастрычніка -** **105 гадоў** з дня нараджэння **Пешкура Івана Іванавіча,** мастака тэатра, жывапісца (па яго эскізах былі пашыты сцэнічныя касцюмы для «Песняроў», ён прымаў удзел у афармленні спектакляў Цімкавіцкага народнага тэатра), ураджэнца вёскі Вострава Блеўчыцкага сельскага Савета (13.10.1921 – 12.10.1980)

**2026 -** **155 гадоў** з дня нараджэння **Шкляра Яфрэма Ільіча**, савецкага і яўрэйскага кампазітара, дырыжора, музыканта, педагога, ураджэнца вёскі Цімкавічы (1871 – 1943)

**2026 -** **145 гадоў** з дня нараджэння **Мяшэчак Аляксандпы Нічыпараўны**, майстра народнага ткацтва, ураджэнкі вёскі Быстрыца (1881 – 24.06.1982)

**2026 -** **130 гадоў** з дня нараджэння **Кіш Алены Андрэеўны,** беларускай самадзейнай мастачкі (1896 – 1949)

**У 2026 годзе спаўняецца:**

**20 студзеня -** **125 гадоў** як у Капылі было адкрыта **народнае вучылішча** (20.01.1901)

**21 лютага -** **95 гадоў ААТ «Старыца-Агра»** і **25 год** як было прынята рашэнне аб пераўтварэнні калектыўна-долевай гаспадаркі «Новы свет» у адкрытае акцыянернае таварыства «Старыца-Агра» (21.02.1931, 21.02.2001)

**Сакавік, 2026 - 70 гадоў Капыльскаму раённаму цэнтру культуры** (сакавік,1956)

**11 мая -** **65 гадоў** як было заснавана раённае прадпрыемства па вытворча-тэхнічнаму абслугоўванню аграпрамысловага комплексу (з 2001 года - **А АТ «Капыльскі райаграсервіс»)** (11.05.1961)

**Чэрвень, 2026 - 80 гадоў** як ў Капылі было створана **інвентарызацыйна-тэхнічнае бюро** (чэрвень, 1946)

**Першая субота**

| | |
|---|---|
| **ліпеня -** | **100 гадоў** з дня заснавання **Капыльскага РАЙПО (**ліпень, 1926**)** |
| **Ліпень, 2026 -** | **75 гадоў** як быў створаны калгас «**Памяць Леніна»** (з 2004 года – філіял **«Вялікая Раёўка» ААТ «Крыніца»)** (ліпень,1951) |
| **Ліпень, 2026 –** | **160 гадоў Спаса-Вазнясенскай царкве ў** Капылі (1866) |
| **Апошняя субота жніўня -** | **1020 гадоў** з дня заснавання **горада Капыля** і першага пісьменнага ўпамінання аб ім ў Статутнай грамаце аб стварэнні Тураўскай епіскапіі. Тут упамінанне аб Капылі з 1006 года (1006) |
| **1 верасня -** | **25 гадоў ДУА «Гімназія № 1 г. Капыля**» (01.09.2001) |
| **5 верасня -** | **15 гадоў** як рашэннем Капыльскага райвыканкама ад 5.09.2011 № 120 быў прыняты **гімн горада Капыля і Капыльскага раёна**: музыка Сяргея Ждановіча, словы М. Кожуха, С. Ждановіча (05.09.2011) |
| **28 снежня -** | **20 гадоў** як была здана ў эксплуатацыю **радыётэлевізійная перадаючая станцыя** (28.12.2006) |
| **2026 -** | **210 гадоў як** ў Капылі адкрылася **царкоўна-прыходская школа** (1816) |
| **2026 -** | **115 гадоў** як ў Капылі быў пабудаваны **паравы млын** (1911) |
| **2026 -** | **90 гадоў** як ад г. Слуцка была пракладзена **чыгунка на захад ад вёскі Цімкавічы (**1936) |
| **2026 -** | **90 гадоў** як ў Цімкавічах **была створана МТС (**1936) |
| **2026 -** | **75 гадоў** з дня стварэння **ансамбля народных інструментаў «Капыльскія дудары»** (1951) |
| **2026 -** | **70 гадоў з** дня заснавання **Камсамольскай сельскай бібліятэкі (**зараз **Камсамольская сельская бібліятэка-клуб**) (1956) |
| **2026 -** | **20 гадоў аграгарадкам Цімкавічы і Старыца** (2006) |

Пры складанні спіса «Старонкі гісторыі Капыльшчыны» былі выкарыстаны наступныя матэрыяпы:


1. Беларуская энцыклапедыя: У18 т. – Мінск.: БелЭн, 1996 – 2002
2. Беларусь: энцыкл. даведнік. – Мінск: БелЭн, 1995.- 799 с.
3. Бельскі, А. Тут іх карані і вытокі: вядомыя людзі з Капыльшчыны ў свеце / Алесь Бельскі.- Мінск: Рэдакцыя часопіса «Роднае слова», 2014.- 71 с.
4. Бельскі, А. Тут наша радзіма: вядомыя людзі з Капыльшчыны ў Беларусі і свеце /Алесь Бельскі. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2018. -152 с.
5. Марціновіч, А. Душа рвецца сюды / Алесь Марціновіч.- Мінск: Беларусь, 2020.- 224 с. – (Падарожжа па родным краі)
6. Минская область: энциклопедия. В 2 т.- Мінск: БелЭн, 2007
7. Памяць:Капыльскі раён: гісторыка-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск: Бел навука, 2001. - 638 с.
8. Звесткі з установы «Дзяржаўны занальны архіў» г. Слуцк

Складальнік: Н.А. Гурло

Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы
ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі»

223927 г. Капыль, вул Замкавая, 1.
Тэл. (01719) 54785
E-mail: bibl@kopyl.gov.by